## АРКАДЗЬ ІОСІФАВІЧ НАРКЕВІЧ



10 сакавіка споўнілася 70 гадоў вядомаму беларускаму лінгвісту, доктару філалагічных навук, прафесару Аркадзю Іосіфавічу Наркевічу. Сялянскі сын з вёскі Вараноўшчына Капыльскага раёна Мінскай вобласці, ён з дзяцінства зацікавіўся багаццем і мілагучнасцю роднай мовы і вырашыў пасля заканчэння сярэдняй школы паступіць у Мінскі дзяржаўны педагагічны інстытут. Пасля заканчэння яго ў 1951 г. А.І.Наркевіч працаваў у школе, потым паступіў у аспірантуру, паспяхова закончыўшы яе ў 1955 г. Пасля гэтага А.І.Наркевіч працаваў малодшым, а потым старшым навуковым супрацоўнікам Інстытута мовазнаўства АН БССР. У 1956 г. абараніў кандыдацкую дысертацыю на тэму "Спосабы выражэння азначэнняў у сучаснай беларускай мове".

Галоўнымі аб'ектамі навуковых даследаванняў А.І.Наркевіча з'яўляюцца марфалогія і сінтаксіс сучаснай беларускай мовы, а таксама некаторыя пытанні лексікалогіі і стылістыкі. А.І.Наркевіч з'яўляецца сааўтарам буйных акадэмічных прац "Курс сучаснай беларускай літаратурнай мовы: Сінтаксіс" (1969) і "Граматыка беларускай мовы" (т.1–2, 1962–1966).

З 1965 г. Аркадзь Іосіфавіч працуе ў Беларускім дзяржаўным універсітэце, спачатку – на філалагічным факультэце, пазней – на кафедры стылістыкі і літаратурнага рэдагавання факультэта журналістыкі. Некаторы час быў загадчыкам кафедры, прафесарам гэтай кафедры ён працуе і цяпер. А.І.Наркевіч шмат гадоў чытае курс сучаснай беларускай літаратурнай мовы. Вынікам яго плённай педагагічнай працы з'явіўся "Практычны курс сучаснай беларускай мовы" (1992).

У 1973 г. А.І.Наркевіч абараніў доктарскую дысертацыю на тэму "Сістэма словазлучэнняў у сучаснай беларускай літаратурнай мове: структурна-семантычнае апісанне", асноўныя палажэнні якой выкладзены ў манаграфіі "Сістэма словазлучэнняў у сучаснай беларускай мове". У гэтай манаграфіі, а таксама ў манаграфіі "Назоўнік: Граматычныя катэгорыі і формы" (1976) даследчык на багатым фактычным матэрыяле прааналізаваў уласцівыя беларускай мове словазлучэнні з боку іх структуры, граматычныя катэгорыі і формы назоўніка.

Пяру А.І.Наркевіча належаць такія цікавыя працы, як "Варыянтнасць склонаў назоўніка", "Аб некаторых асаблівасцях беларускай літаратурнай мовы", "Грані слова", "Народжаныя часам", "Жывое слова" і іншыя.

Гаворачы пра актыўную навукова-даследчую і педагагічную дзейнасць А.І.Наркевіча, неабходна адзначыць і такі важны бок яго працы, як культурна-асветніцкая і папулярызатарская дзейнасць, накіраваная на фарміраванне высокай культуры мовы ў супрацоўнікаў беларускіх сродкаў масавай інфармацыі. А.І.Наркевіч доўгі час быў адным з навуковых рэдактараў кафедральных зборнікаў "Культура мовы журналіста" (1982–1992 гг.). Апублікаваныя ў гэтых зборніках і іншых перыядычных выданнях артыкулы А.І.Наркевіча "Словаспалучальныя ўтварэнні ў мове прэсы", "Метафарычныя спалучэнні ў мове прэсы", "Наватварэнні і моўныя штампы", "Слова і час: Актыўная і пасіўная лексіка ў мове прэсы" і многія іншыя сведчаць аб шырокім дыяпазоне творчых інтарэсаў даследчыка, аб яго цікавасці да актуальных працэсаў у мове беларускіх СМІ. Дастаткова сказаць, што толькі ў 1998 г. А.І.Наркевіч апублікаваў 25 навуковых артыкулаў, усяго ж на яго творчым рахунку каля 400 навуковых прац, у тым ліку 20 навукова-метадычных і папулярных брашур.

Адзначаючы значны ўклад юбіляра ў развіццё беларускага мовазнаўства, хочацца пажадаць яму добрага здароўя, далейшай плённай працы на ніве філалогіі і журналістыкі.

М.Я.Цікоцкі

## СВЯТЛАНА МІХАЙЛАЎНА ПРОХАРАВА



З красавіка адзначыла свой юбілей прафесар кафедры прыкладной лінгвістыкі Белдзяржуніверсітэта, доктар філалагічных навук Святлана Міхайлаўна Прохарава.

С.М.Прохарава нарадзілася ў Мінску і ўсё яе жыццё непарыўна звязана з родным горадам, а творчая дзейнасць – з Беларускім дзяржаўным універсітэтам, які яна закончыла з адзнакай у 1961 г. Толькі некалькі год па размеркаванні яна працавала рэдактарам у апараце Савета Міністраў і ўжо ў 1967 г. стала аспіранткай БДУ. З 1970 г. і па сённяшні дзень С.М.Прохарава на выкладчыцкай працы. У 1991 г. яна абараніла доктарскую дысертацыю на тэму "Ареально-типологическая характеристика синтаксиса переходной русско-белорусской зоны".

С.М.Прохараву можна смела назваць наватарам. Пра гэта сведчыць уся яе навуковая дзейнасць, звязаная са станаўленнем новай навуковай парадыгмы. У цяперашні час Святлана Міхайлаўна чытае курс лекцый па кагнітыўнай лінгвістыцы, спецкурсы, вядзе спецсемінар, шмат увагі надае навуковай працы студэнтаў.

С.М.Прохарава – аўтар 150 друкаваных прац, якія адлюстроўваюць разнастайнасць яе даследчых пошукаў. Гэта праблема пераходнасці, даследаванне сінтаксічных балтызмаў, выяўленне нацыянальна-культурнага кампанента ў мове і тэксце. С.М.Прохаравай распрацавана тэорыя вертыкальных сінтаксічных палёў, якая грунтуецца на агульнай тэорыі поля і з'яўляецца развіццём фрэйм-граматыкі. Работы С.М.Прохаравай атрымалі прызнанне навуковай грамадскасці Масквы і іншых гарадоў Расіі, краін СНД, а таксама Польшчы, Літвы, Славакіі, Чэхіі, Германіі, ЗША, Францыі.

С.М.Прохарава – віцэ-прэзідэнт Беларускай асацыяцыі камунікатыўнай лінгвістыкі, член Прэзідыума Міжнароднай асацыяцыі выкладчыкаў рускай мовы. Яна ўваходзіць у склад іншых міжнародных асацыяцый, падтрымлівае цесныя навуковыя сувязі з універсітэтам Марыі Кюры-Складоўскай у Любліне і Гданьскім універсітэтам, дзе яна працавала яшчэ ў 1973–1975 гг., з'яўляецца членам рэдкалегіі часопіса "Русский язык за рубежом".

Святлана Міхайлаўна ўдзельнічала ў рабоце многіх міжнародных лінгвістычных кангрэсаў, з'ездаў і канферэнцый.

У Белдзяржуніверсітэце С.М.Прохарава арганізавала і правяла міжнародныя канферэнцыі "Ареология: проблемы и достижения" (1993) і "Национально-культурный компонент в тексте и языке" (1994), акрамя таго, яна была ініцыятарам канферэнцыі "Когнитивная лингвистика конца XX века", праведзенай у Мінскім дзяржаўным лінгвістычным універсітэце (1997).

С.М.Прохарава падрыхтавала 6 кандыдатаў навук. Яе вучні з годнасцю прадстаўляюць Беларусь на шматлікіх міжнародных кангрэсах і канферэнцыях, уносяць свой уклад у развіццё лінгвістыкі.

Высокакваліфікаваны вучоны-лінгвіст і таленавіты выкладчык Святлана Міхайлаўна Прохарава мае вялікі творчы патэнцыял, смелыя планы на будучыню. Свой юбілей яна адзначае падрыхтоўкай другой міжнароднай канферэнцыі "Национально-культурный компонент в тексте и языке". Віншуем Святлану Міхайлаўну, шчыра зычым ёй моцнага здароўя, вялікага шчасця і новых навуковых дасягненняў.

Калегі і вучні